*Святлана Пацыенка*

# Мірскі замак як адзін з цэнтраў магнацкай культуры на Беларусі

Нягледзячы на складаныя гістарычныя ўмовы існавання Беларускай дзяржавы, на яе тэрыторыі захавалася даволі значная колькасць гісторыка-культурных помнікаў розных часоў і эпох. Асаблівае месца ў архітэктурнай спадчыне займаюць аб'екты замкавага дойлідства.

Культура прыватнаўласніцкіх замкаў прадстаўляе сабой значны і недастаткова даследаваны пласт у гісторыі культуры Беларусі. Прастора такіх замкаў фарміравалася і існавала пад непасрэдным уздзеяннем арыстакратыі. Адзначым, што навуковых прац па вывучэнні арыстакратычнай культуры, напісаных беларускімі аўтарамі, няшмат, і іх пераважная большасць з'явілася ў апошнія дзесяцігоддзі [1]. Прычынай гэтага стала ідэалагічная накіраванасць беларускай навукі паслякастрычніцкага перыяду, калі даследаванню культуры прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя надавалася недастатковая ўвага. Тым не менш, арыстакратычная культура, якая існавала ў замкавым асяроддзі, прадстаўляла сабой магутны патэнцыял, праяўленні якога закранаілі практычна ўсе сферы чалавечай дзейнасці. Намаганнямі беларускіх магнатаў, якія валодалі значнымі

1 Вывучэннем разнастайных аспектаў існавання беларускай арыстакратыі займаецца гісторык А.П. Грыцкевіч, якому належыць шэраг публікацый па гісторыі шляхецкага саслоўя («Беларуская шляхта» [3], «Шляхта Вялікага княства Літоўскага да Люблінскай уніі 1569 г.» [4] і інш.). Даследаванню гістарычнай ролі беларускай арыстакратыі ў палітычным жыцці краіны прысвечаны публікацыі Г.Я. Галенчанкі («Шляхетская демократия» в Великом княжестве Литовском XVI–XVIII вв.») [5], П.А. Лойкі («Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст.») [6], Г.М. Сагановіча («Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст.») [7] і інш. Вывучэннем радзівілаўскай спадчыны займалася К.Я. Шышыгіна-Патоцкая (напр., «Нясвіж і Радзівілы» [12] і інш.).

магчымасцямі, была створана самабытная культура, здабыткі якой варты ўзроўню не толькі агульнаеўрапейскага, але сусветнага маштабу. Менавіта замкавая прастора стала тым месцам, дзе стваралася, захоўвалася і назапашвалася унікальная культурная інфармацыя.

Магнацкая культура характарызавалася шэрагам асаблівых прызнакаў. Яе носьбітам была ўласціва карціна свету, якая грунтавалася на ўсведамленні асабістай свабоды (дактрына «залатой вольнасці»). У сістэме каштоўнасцей магнацкай супольнасці дамінінавалі такія паняцці, як высакародства і старажытнасць паходжання, шляхецкі гонар. Спецыфічныя сацыяльныя інстытуты насілі ваенна-палітычны характар і былі прадстаўлены такімі ўтварэннямі, як Вялікая Рада, сейм, канфедэрацыя і яе разнавіднасць у форме рокаша, паспалітае рушэнне. Сімволіка магнацкай культуры праявілася ў наяўнасці развітой геральдычнай традыцыі, а менавіта — сістэмы спадчынных знакаў адрознення — радавых гербаў. Неад'емным атрыбутам арыстакратычнай сімволікі была зброя. Асаблівасці стылю і вобраза жыцця магнатаў праявіліся ў магчымасці атрымання адукацыі высокага ўзроўню, прызначэння на прэстыжныя дзяржаўныя пасады, у адносінах да інстытута шлюбу як сродку падтрымання ці павышэння статуса ў грамадстве.

У сваім развіцці магнацкая культура на Беларусі прайшла наступныя этапы: зараджэнне і фарміраванне (канец XIII – XV ст.), росквіт (XVI – сярэдзіна XVII ст.) і заняпад (канец XVII – XVIII ст.). Першы этап быў часам падрыхтоўкі будучага росквіту, стварэння і назапашвання форм і традыцый магнацкай культуры. За гэты перыяд адбылося фарміраванне вышэйшага саслоўя як асобага стану грамадства, быў пакладзены пачатак працэсу надання прывілеяў, якія ў наступныя перыяды завяршыўся стварэннем комплексу шляхецкіх вольнасцей. На першым этапе адбылося фарміраванне асноўных адзнак магнацкай культуры.

Росквіт арыстакратычнай культуры на беларускіх землях прыпаў на XVI – сярэдзіну XVII ст. Гэты перыяд характарызаваўся далейшым пашырэннем правоў і свабод прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. На змену вайсковай арыентацыі магнацкай культуры пачала прыходзіць свецкая. Пераход гэты адбываўся павольна. Так як войны ў краіне па-ранейшаму не спыняліся, арыстакратыя выму-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шана была прымаць у іх удзел. Аднак ужо ў першай чвэрці XVI ст. з'явіліся альтэрнатывы службе ў войску: «А магнаты... адкупаюцца ў начальніка грашыма і застаюцца дома; і гэта зусім не лічыцца ганьбай, так што маршалкі і начальнікі войска загадваюць усенародна абвяшчаць у сеймах і ў лагеры, што калі хто пажадае адкупіцца [наяўнымі] грашыма, можа вызваліцца (ад службы) і вярнуцца дадому» [2, 186–187]. Часам вайсковая дзейнасць магнатаў трансфармавалася ў палітычную: многія прадстаўнікі арыстакратыі рэалізавалі сябе на глебе палітыкі і дыпламатыі.

Перыяд росквіту арыстакратычнай культуры завяршыўся стварэннем магнацкай ідэалогіі, якая аформілася ў такой самабытнай культурнай з'яве, як сарматызм. У аснове сарматызму ляжаў саслоўны міф аб паходжанні прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя ад сарматаў — ваяўнічых плямён Паўночнага Прычарнамор'я, якія ў першыя стагоддзі нашага часу захапілі тэрыторыю некаторых славянскіх краін (у тым ліку і Вялікага княства Літоўскага).

Сарматызм даваў выдатную магчымасць арыстакратам прадэманстраваць сваё багацце і знешне падкрэсліць асаблівасць паходжання. Невыпадковым у гэтай сувязі стаў зварот да культуры Усходу з яе экзатычнасцю (якая набывала асаблівае значэнне ў эпоху барока) і раскошай. Лад жыцця, прытрымлівацца якога вымушала ідэалогія сарматызму, спрыяў упарадкаванню і уніфікацыі магнацкага побыту. Існавалі спецыяльныя патрабаванні да знешняга выгляду, заняткаў і паводзін прадстаўнікоў арыстакратыі (нашчадак сарматаў павінен быў шанаваць традыцыі, адзначаць сямейныя ўрачыстасці і рэлігійныя святы, быць шчодрым і гасцінным, насіць сармацкае адзенне, мець каштоўную парадную зброю і інш.).

Часы росквіту магнацкай культуры былі адзначаны актыўным замкавым будаўніцтвам. З пачатку XVI ст. на беларускіх землях пачалі з'яўляцца прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі. Радавыя замкі Храптовічаў у Любчы, Радзівілаў у Нясвіжы, Сангушкаў у Смалянах, Глябовічаў у Заслаўі і іншыя прадстаўлялі сабой сапраўдныя цэнтры магнацкай культуры.

Выдатным прыкладам цэнтра магнацкай культуры з'яўляецца Мірскі замак. У замкавай прасторы знайшлі ўвасабленне светапоглядныя ўстаноўкі прадстаўнікоў арыстакратыі. Усведамлен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не асабістай свабоды, на якім была пабудавана магнацкая карціна свету, вымушала ўвасабленне свабоды і незалежнасці ў жыллёвай прасторы. Мірскі замак гарантаваў сваім уладальнікам некалькі ступеняў незалежнасці: па-першае, магнаты жылі ў сваім уласным замку, па-другое, іх жыллё размяшчалася ў асобным будынку палаца, па-трэцяе, яны мелі асобныя ўласныя пакоі. Такім апасрэдаваным чынам Мірскі замак дэманстраваў высокую ступень індывідуалізму магнацкай культуры.

Прыватнаўласніцкі замак можна разглядаць як матэрыяльнае выражэнне абсалютнай арыстакратычнай свабоды, незалежнасці і сілы. Як дакладна адзначыў М. А. Бярдзяеў: «Свабода была перш прывілеяй арыстакратыі. Феадальны рыцар абараняў сваю свабоду і незалежнасць у сваім замку са зброяй у руках. Пад'ёмны мост быў абаронай свабоды феадальнага рыцара, свабоды не ў грамадстве і дзяржаве, а свабоды ад грамадства і дзяржавы» [9, 106]. Дасканалая сістэма ўмацаванняў Мірскага замка (пяць вежаў — самастойных вузлоў абароны; сцены таўшчынёй да 3 м каля падмурка і вышынёй каля 13 м; 9-метровыя земляныя валы і г. д.) давала яго ўладальнікам магчымасць больш упэўнена адчуваць сябе ў складаных палітычных умовах Вялікага княства Літоўскага.

Уладанне замкам дазваляла арыстакратам прадэманстраваць сваё месца ў соцыуме. Так, дзякуючы наяўнасці Мірскага замка, Юрый Ільініч атрымаў тытул графа "Свяшчэннай Рымскай імперыі на Міры". У. Сыракомля лічыў атрыманне тытула адной з галоўных прычын будаўніцтва Мірскага замка [8]. Акрамя таго, замак выконваў рэпрэзентатыўную функцыю, сваёй магутнасцю і прыгажосцю падкрэсліваючы багацце і моц уладароў. «Для таго, каб заслужыць і захаваць павагу людзей, недастаткова толькі валодаць багаццем і ўладай. Багацце ці ўладу трэба зрабіць відавочным, бо павага аказваецца выключна па прадстаўленні доказаў» [1, 84]. Менавіта ўзвядзенне ўласнай рэзідэнцыі было самым дзейсным доказам асабістай значнасці і наяўнасці багацця. Ролю знешняй дэманстратыўнасці пабудовы адзначаў нямецкі філосаф О. Шпенглер: «Замак з яго пакоямі, вежамі, сценамі і равамі гаворыць пра магутна працякаючае быццё» [11, 351].

У прыватнаўласніцкім будаўніцтве выразна праявілася знакавасць магнацкай культуры. Наяўнасць замка выступала як знак вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакародства (аб чым сведчыла ўладанне графскім тытулам), так як багацце было знакам шчодрасці, генеалагічныя дрэвы і фамільныя крыпты — знакам старажытнасці роду, зброя — знакам доблесці і вайсковых подзвігаў, будаўніцтва рэлігійных установ — знакам адданасці Богу і інш. Замак выконваў ролю знака, які дэманстраваў асаблівае становішча прадстаўніка арыстакратычнай культуры.

Пачынаючы з канца XVII і асабліва ў XVIII ст. магнацкая культура ўвайшла ў стадыю заняпаду, арыстакратычныя двары ў былым іх значэнні перажывалі крызіс. «Іх канец наступіў у розных краінах прыблізна адначасова, хаця прычыны для гэтага былі розныя… Не мела значэння, якой была па сваму характару гэтая прычына — ці чыста палітычная, грамадска-палітычная, ці эканамічна-палітычная, бо яна прыводзіла да аднаго выніку — матэрыяльнага збяднення і палітычнага заняпаду старой арыстакратыі» [10, 10–11].

Крызіс радавой арыстакратыі, узмоцнены знешне- і ўнутрыпалітычнымі праблемамі Вялікага княства Літоўскага, прывёў да адмаўлення магнатаў ад будаўніцтва замкавых комплексаў. Паступова замкавая архітэктура змянілася палацавай: будаўніцтва жылля для арыстакратыі працягвалася, але яно пачало набываць іншы змест, і як вынік — іншыя формы.

Праходзілі стагоддзі, новыя замкі не з'яўляліся, а старыя павольна разбураліся. Аднак магутны патэнцыял, якім валодала магнацкая культура, не знік бясследна. Нават сёння, у пачатку трэцяга тысячагоддзя, мы маем магчымасць наведаць адзін з сапраўдных цэнтраў магнацкай культуры, размешчаны ў Міры.

## Літаратура


1. Веблен, Т. Теория праздного класса / Т. Веблен; пер. с англ. С. Г. Сорокиной; общ. ред. В. В. Мотылева. — М.: Прогресс, 1984. — 367 с.
2. Герберштейн, С. Записки о Московии / С. Герберштейн. — М.: Изд-во МГУ, 1988. — 430 с.
3. Грыцкевіч, А. П. Беларуская шляхта / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. — 1993. — № 1. — С. 11–16.
4. Грыцкевіч, А. П. Шляхта Вялікага княства Літоўскага да Люблінскай уніі 1569 г. / А. П. Грыцкевіч // Годнасць. — 1993. — № 1. — С. 16–27.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Галенченко, Г. «Шляхетская демократия» в Великом княжестве Литовском XVI–XVIII вв. / Г. Галенченко // Белоруссия и Россия: общества и государства. Сборник; отв. ред. Д. Е. Фурман. — М.: Права человека, 1998. — С. 31–56.
6. Лойка, П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. / П. А. Лойка. — Мінск: БДУ, 2002. — 99 с.
7. Сагановіч, Г. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. / Г. Сагановіч; пад рэд. Г. В. Штыхава. — Мінск: Навука і тэхніка, 1994. — 79 с.
8. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў / У. Сыракомля; пер. з польскай мовы, прадм., камент. К. Цвіркі. — Мінск: Полымя, 1992. — 159 с.
9. Царство Духа и царство Кесаря / сост. П. В. Алексеева. — М.: Республика, 1995. — 382 с.
10. Цеханавецкі, А. Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме / А. Цеханавецкі; пер. з ням. мовы У. Сакалоўскага; нав. рэд. А. Мальдзіс. — Мінск.: Беларусь, 1993. — 176 с.
11. Шпенглер, О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории / О. Шпенглер; пер. и прим. И. И. Маханькова. — М.: Мысль, 1998. — 538 с.
12. Шышыгіна-Патоцкая, К. Я. Нясвіж і Радзівілы / К. Я. Шышыгіна-Патоцкая. — Мінск: Полымя, 2001. — 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ